Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

DOI:10.17951/sb.2018.12.270-279

Біяграфічны нарыс з элементамі літаратуразнаўства

Андрэй Мельнікаў, *Анатоль Сыс. Псальмяр эпохі перагною.* Мінск: Харвест, 2017, 64 с.

На беларускім кніжным рынку ў адрозненні ад расійскага ці польскага вельмі рэдка з'яўляюцца біяграфічныя нарысы пра пісьменнікаў. Прыемным выключэннем з'яўляецца серыя „100 выдатных дзеячаў культуры" (выдавецтва „Харвест", каардынатар серыі – Анатоль Тарас), якая парадавала аматараў беларускаай літаратуры кнігамі пра Францішка Аляхновіча, Уладзіміра Караткевіча, Міхася Стральцова, а ў мінулым годзе выпусціла кнігу пра Анатоля Сыса (1959–2005), напісаную прыхільнікам таленту і прыяцелем паэта, вядомым бардам Андрэем Мельнікавым. Фактычна, гэта ўжо другі нарыс жыцця і творчасці Анатоля Сыса пасля выдатнага эсэ Леаніда Галубовіча *„Як шаравая маланка...",* упершыню апублікаванага ў 2006 г. у часопісе „Калосьсе" і перадрукаванага ў 2010 г. у кнізе Галубовіча *Сыс і кулуары*.

Увогуле, пра Анатоля Сыса напісана вельмі шмат: сяброўскіх успамінаў, літаратуразнаўчых артыкулаў, мастацкіх твораў. Прычынай павышанай увагі да паэта з'яўляюцца не толькі яго таленавітыя вершы, але і яго неардынарная, супярэчлівая асоба, якая прыцягвала да сябе, гіпнатызавала і ў той жа час шакіравала, адштурхоўвала тых, хто ведаў паэта і назіраў дзіўную, пакручастую траекторыю ягонага лёсу. Анатоля Сыса яшчэ пры жыцці называлі Паэтам з Божай ласкі, прарокам, геніем, але таксама – блазнам, выродкам, хамам, і ўсе, хто пісаў пра яго, спрабавалі разгадаць таямніцу ягонай асобы і прыроду ягонага таленту.

Выданне кнігі пра Анатоля Сыса ў серыі „100 выдатных дзеячаў культуры", далучэнне скандальна-багемнага паэта да пантэону такіх шанаваных постацяў як Вацлаў Ластоўскі, Аркадзь Смоліч, Язэп Драздовіч, Рыгор Шырма – сам па сабе адважны крок, які, напэўна, здзівіць тых, хто ведаў (ці хаця б бачыў) Анатоля Сыса толькі ў апошнія гады ягонага жыцця, а не ў легендарныя перабудовачна-адраджэнскія часы, калі паэт узрушваў сваімі вершамі натоўпы на мітынгах і збіраў поўныя залі на творчых вечарынах. Разам з тым, гэта яшчэ адзін важны крок у працэсе кананізацыі творчасці пісьменніка, пошук для яго адпаведнага месца ў гісторыі беларускай літаратуры: калі не побач з Купалам і Багдановічам, як пазіцыяніраваў ён сябе сам, то прынамсі як творчага лідара пакалення, выдатнага паэта канца XX ст.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

Перад аўтарам кнігі, Андрэем Мельнікавым, стаяла нялёгкая задача. З аднаго боку, існавала небяспека ўпасці ў адраджэнскую апалагетыку, аддзяліць Сыса-паэта ад Сыса-чалавека і паказаць яго гэткім Анёлам, які запэцкаў свае белыя крылы ў жыццёвым брудзе. З іншага боку, спакушала магчымасць пачаставаць чытача апісаннем шматлікіх скандалаў з удзелам Сыса, засяродзіцца на пераказе міфаў і анекдотаў, якіх багата назбіраліся вакол асобы паэта. Акрамя таго, чарговы нарыс пра Сыса непазбежна трапляў у інтэртэкстуальнае поле раней напісаных тэкстаў пра пісьменніка, калі кожны чытач мог зверыць звесткі і высновы аўтара кнігі з успамінамі Алеся Бяляцкага, Віктара Шніпа, Адама Глобуса, Алеся Аркуша, Уладзіміра Сцяпана, Валеры Куставай і, канечне ж, з памянёным нарысам Леаніда Галубовіча *„Як шаравая маланка...”*.

Да гонару Андрэя Мельнікава трэба прызнаць, што яму ўдалося прайсці паміж Сцылай і Харыбдай: кніга *Анатоль Сыс. Псальмяр эпохі перагною* напісана з павагай і любоўю да героя, але без ідэалізацыі і прыхарошвання ягонай асобы. У нарысе сабраныя і ўпарадкаваныя многія звесткі з успамінаў сяброў Анатоля Сыса, але ёсць і новыя факты, цікавыя назіранні і высновы, якія дапамагаюць зразумець супярэчлівую натуру Анатоля Сыса і ягоны трагічны лёс.

У караценькім *Уступе* аўтар тлумачыць назву і канцэпцыю кнігі, згадваючы выказванне Анатоля Сыса з 1988 г.: „Нашае сёньняшняе пакаленьне Адраджэньня, павінна стаць гноем для наступных” (Sys, 2007, s. 266). Андрэй Мельнікаў, які ведаў Сыса асабіста, прызнаецца, што абапіраўся ў кнізе пераважна на ўспаміны сяброў паэта, апублікаваныя ў часопісах „Крыніца”, „Дзеяслоў”, „Калоссе”, ад сябе ж дадаў „[…] не столькі ўспаміны, колькі рэфлексіі на частку таго, што стварыў паэт. А ён, мяркую, несвядома стварыў беларускі паэтычны каментар на кнігу „Псалтыр”” (Mielnikau, 2017, s. 4). Такім чынам, чытачу прапануецца сінтэз біяграфічнага нарыса і літаратуразнаўчага даследавання, і менавіта літаратуразнаўчыя рэфлексіі над творчасцю Сыса *як псальмяра* з’яўляюцца, на думку аўтара, найбольш арыгінальнай часткай кнігі. Адзначу на палях, што ўзнаўленне біяграфіі пісьменніка сапраўды немагчыма без разгляду ягонай творчай эвалюцыі, але ўзнікае заканамернае пытанне: ці адпаведны код для гэтага выбраны?

Першая частка кнігі Мельнікава мае назву *Сыс спасцігае свет* і прасочвае шлях паэта ад нараджэння 26 кастрычніка 1959 г. у вёсцы Гарошкаў Гомельскай вобласці да мітынгу ў Курапатах пад Мінскам 30 кастрычніка 1988 г. Згадваюцца дзяцінства паэта, студэнцкія гады, служба ў войску, непрацяглая праца журналістам у раённай газеце, пераезд у Мінск, грамадска-палітычная дзейнасць і імклівы росквіт таленту Сыса ў перабудовачна-адраджэнскі час. Слушна адзначаецца ўплыў на фарміраванне асобы паэта моладзевага патрыятычнага руху сярэдзіны 80-х гг., а канкрэтна – суполкі „Талака”, кіраўніком якой быў Сяржук Вітушка. У той жа час падкрэсліваецца крэатыўная роля Сыса як аднаго з заснавальнікаў і лідэраў Таварыства маладых літаратараў „Тутэйшыя”. У параўнанні з біяграфічным нарысам Леаніда Галубовіча ў нарысе Андрэя Мельнікава больш падрабязна апісаны студэнцкі перыяд жыцця Анатоля Сыса, ягоная вучоба ў Го-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

мельскім універсітэце. І гэта не дзіўна, бо сам Мельнікаў жыве ў Гомелі і звязаны з універсітэцкім асяроддзем.

Другая частка кнігі – *Сыс-кумір* – ахоплівае перыяд з кастрычніка 1988 г. да чэрвеня 2001 г., калі выйшаў у свет 66-ы нумар часопіса „Крыніца", прысвечаны асобе і творчасці Анатоля Сыса. Здабыўшы ў 1986–1988 гг. шырокую папулярнасць сярод чытачоў і аўтарытэт у літаратурным асяроддзі, Анатоль Сыс выходзіць з „Тутэйшых" (зрэшты, і „Тутэйшыя", і „Талака" неўзабаве распаліся), уступае ў Саюз пісьменнікаў БССР і пачынае весці багемны лад жыцця, з паэта-прарока ператвараючыся спачатку ў паэта-скандаліста і блазна, а потым – у „клятага паэта" і алкаголіка-маргінала.

Леанід Галубовіч у свой час выказаў меркаванне, што змена іміджу Анатоля Сыса на пераломе 80–90-х гг., маргінальны лад жыцця і ранняя смерць паэта былі яго свядомым выбарам, аўтарскай стратэгіяй стварэння *рэпутацыі выкляцтага нацыянальнага паэта,* дзеля таго, каб застацца ў гісторыі беларускай літаратуры (Hałubowicz, 2010, s. 10).

Як і ўсе, хто пісаў пра Сыса, Андрэй Мельнікаў спрабуе знайсці разгадку нечаканай метамарфозы паэта, змены ягонай жыццёвай траекторыі пасля выхаду ў свет зборнікаў *Агмень* (1988) і *Пан Лес* (1989). Яшчэ ў першым раздзеле кнігі Андрэй Мельнікаў звяртаў увагу на генетычную залежнасць Анатоля Сыса ад алкаголю: „Бацька паэта – Ціхан Сыс – моцна піў. Залежнасць перадалася Анатолю і паспрыяла заўчаснаму скону паэта" (Mielnikau, 2017, s. 9). У другім раздзеле падкрэсліваецца негатыўны ўплыў на Сыса саюзапісьменніцкага асяроддзя і новых сяброў:

> Ганарар Анатоль траціў па славянскай завядзёнцы – у кабаках. Спасцігаў „Мінск злачынны" пад апекаю знаўцаў тэмы Уладзіміра Някляева і Аляксея Дударава – тых, якія рэкамендавалі Сыса ў Саюз пісьменнікаў. […] У адрозненне ад Някляева з Дударавым, якія дысцыплінавана аддзялялі работу ад выпіўкі, Анатоль цяпер стаў піць і на рабоце. З дзесяткамі старых і новых знаёмцаў, з выпадковымі сустрэчнымі... (Mielnikau, 2017, s. 39–40).

Апрача генетычнай залежнасці Сыса ад алкаголю і негатыўнага ўплыву асяроддзя, Андрэй Мельнікаў сярод прычынаў скандальнага ладу жыцця паэта слушна называе такую асаблівасць характару Сыса, як імкненне да сцэнічных эфектаў (Mielnikau, 2017, s. 38), прагу ператвараць любое месца прысутнасці ў сцэну для выступаў (Mielnikau, 2017, s. 53). Пра гэта ж пісаў і Леанід Галубовіч: „Быць заўжды на слыху, вылучаным на людзях паступова перарастала ў паўсядзённую патрэбу" (Hałubowicz, 2010, s. 5). А заўзяты сябра Анатоля Сыса Мікалай Сцепаненка ўспамінаў, што нават выпіваць паэт стараўся публічна, у прысутнасці сабутыльнікаў і выпадковых гледачоў:

> Я ведаю шмат людзей (і ў пісьменьніцкім асяроддзі таксама), якія пілі больш і часьцей за Анатоля. Але ж яны, перад тым, як выпіць, зачыняліся на ўсе замкі ў кабінетах,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

> адключалі тэлефон, захіналі фіранкі. І ня дай Бог, каб нехта заўважыў. Анатоль выпіваў публічна, і чым больш людзей за ім назірала, тым большае задавальненьне ён атрымліваў. Сыс любіў паўтараць:
>
> – Калі нямашака ніякага іміджу, хай жа будзе хоць гэтакі! (Sciepanienka, 2006, s. 194).

Андрэй Мельнікаў досыць нечакана, але трапна параўноўвае героя сваёй кнігі з Грыгорыем Распуціным:

> У інтэлігенцкім асяроддзі беларускай літаратуры 90-х гадоў Анатоль Сыс бадай наўмысна імкнуўся падкрэсліць сваю „простасць", што часам выглядала юродствам, а часцей беспардоннасцю і хамствам. Ды падобна Грыгорыю Распуціну ў расейскай „эліце", у эліце беларускіх пісьменнікаў з такімі паводзінамі звыкліся, і калі не ўспрымалі іх прымальнымі, то, прынамсі, такімі, ад якіх падобнага чалавека не адвучыш (Mielnikau, 2017, s. 45–46).

У другім раздзеле кнігі Мельнікава, у адрозненні ад першага, ёсць асабістыя ўспаміны аўтара пра Анатоля Сыса: каларытная сцэнка з так званым „інтэрв'ю" ў кватэры паэта і з доўгімі провадамі на гомельскі цягнік аўтара кнігі (дзеянне адбывалася ў красавіку 1999 г.).

Падобная сцэнка прысутнічае і ў трэцяй частцы кнігі, якая называецца *Сысаў Псалтыр* і прысвечана апошнім гадам жыцця Анатоля Сыса – з канца 90-х гг. да ягонай смерці 5 траўня 2005 г. Сустрэча з паэтам адбылася цяпер ужо ў гомельскай кватэры аўтара кнігі, які потым праводзіў госця на мінскі цягнік і рataваў на вакзале ад міліцыянтаў (дзеянне адбывалася восенню 2002 г.). Магчыма, асабістыя ўспаміны Андрэя Мельнікава выбіваюцца стылістычна з асноўнай канвы кнігі, але затое добра адлюстроўваюць асаблівасці характару і паводзінаў героя і надаюць біяграфічнаму нарысу каларыт і арыгінальнасць (адзначу, што ў іншых біяграфічных нарысах з серыі „100 выдатных дзеячаў культуры" таксама прысутнічаюць асабістыя ўспаміны аўтара пра героя: напрыклад, у кнігах кінарэжысёра Уладзіміра Арлова пра Уладзіміра Караткевіча і Уладзіміра Мулявіна).

Андрэй Мельнікаў апісвае апошнія гады жыцця Анатоля Сыса, калі „сталічны нацыянальны бамонд стаміўся ад Сыса і ўсё больш дэманстратыўна цураўся яго" (Mielnikau, 2017, s. 53), калі беспрацоўны паэт кожнае лета з'яжджаў ў родную вёску да старэнькай маці, дзе дапамагаў даглядаць гаспадарку. Падрабязна апісваецца ў кнізе самотная смерць Сыса ў ягонай аднапакаёвай кватэры ў Мінску 5 траўня 2005 г., сціплыя провады паэта сябрамі і пахаванне на могілках у Гарошкаве, празваных вяскоўцамі „Раем".

Думаецца, аўтар нарысу занадта жорсткі ў адносінах да калег і сяброў Сыса, сцвярджаючы:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

> З паэтам Сысам калегі і ў апошнія гады жыцця вазіліся шмат: многія лічылі сябе яго сябрамі, апекунамі, цаніцелямі, вучнямі і паслядоўнікамі. Па факту, многія аказаліся магільшчыкамі: дапамагалі співацца, дэградаваць у паводзінах, губляць стасункі (Mielnikau, 2017, s. 53).

З 1991 г. па 2005 г. Анатоль Сыс не меў сталай працы і жыў, фактычна, на ахвяраванні сяброў і прыхільнікаў таленту. Леанід Галубовіч у сваім нарысе згадвае гэтых фундатараў з павагай і ўдзячнасцю, многіх называе паіменна:

> Нельга сказаць, што паэт быў пакінуты ў гэтым свеце на беспрасветную адзінокасць. Многія з ім намагаліся сябраваць і падтрымліваць *агмень* яго згасаючага жыцця... Асобныя (хочацца верыць, бескарысна) дапамагалі матэрыяльна (нейкі час гэта нават лічылася своеасаблівымі творчымі стыпендыямі): Алесь Суша, Валянцін Дубатоўка, Адам Глобус (не раз сплачваў „добра нагрэўшыя" ЖЭСаўскія жыроўкі), Уладзімір Някляеў (падараваў тэлевізар і іншае), Валянціна Якімовіч (ЗША, фундавала апошні зборнік паэта)... (Hałubowicz, 2010, s. 22).

Андрэй Мельнікаў сам згадвае ў кнізе прыклады таго, як сябры дапамагалі Сысу: Вінцук Вячорка ўладкаваў яго весці рубрыку *Анталогія беларускай паэзіі* ў газеце „Звязда" (Mielnikau, 2017, s. 49), Валянціна Якімовіч ахвяравала на выданне зборніка *Сыс* (2002) грошы, якія зарабіла ў ЗША, даглядаючы старых амерыканцаў і амерыканак (Mielnikau, 2017, s. 54). Але нягледзячы на сяброўскую дапамогу і падтрымку, паэт усёроўна праз нейкі час зрываўся і апускаўся „у вір уласнага бяззладдзя" (Mielnikau, 2017, s. 49).

Ганна Кісліцына ў інтэрв'ю для часопіса „Крыніца" (люты 2001 г.) таксама пыталася ў Сыса пра негатыўную ролю сяброў у ягоным жыцці: „Не ад аднаго чалавека чула, што раней ты быў абыякавы да выпіўкі, але сябры дапамаглі – ад зайздрасці да таленту, да славы..." (Sys, 2006, s. 413). Аднак Анатоль Сыс не стаў звальваць віну на сяброў:

> Ніхто мяне не зводзіў. […] Ніхто мяне не спойваў. Бацька мяне такім зрабіў. У маім раду ўсе пілі, п'юць і будуць піць. […] Грошы мне за першыя кнігі заплацілі вялікія. На той час я кватэру ў цэнтры мог бы купіць. Пачалася зоркавая хвароба – малады, прыгожы, ды яшчэ пры грашах. […] Шкадую, гарэлка мяне падкасіла. Я б зараз зусім па-іншаму распарадзіўся сваім жыццём... (Sys, 2006, s. 414).

Што праўда, Анатолю Сысу належыць наступны верш:

> Я ведаю,
> Я ў карты прагуляны
> Зайздроснымі паэтамі.
> Малю,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

калі заб'еце – не смакчыце з раны
барвовую паэзію маю
(Sys, 2006, s. 414).

Але вернемся да кнігі *Анатоль Сыс. Псальмяр эпохі перагною*. Заканчваецца кніга невялікай *Бібліяграфіяй***,** да якой ёсць вялікія прэтэнзіі. Канечне, нарыс Андрэя Мельнікава – гэта навукова-папулярнае, а не навуковае выданне і таму нельга вымагаць ад аўтара, каб ён пералічыў у *Бібліяграфіі* усе шматлікія публікацыі пра Анатоля Сыса. Але можна вымагаць, каб прынамсі ў згаданых пазіцыях не было памылак. Няма ў Галубовіча кнігі: *„Як шаравая маланка". (Нарыс жыцця і творчасці паэта Анатоля Сыса),* Мінск: Літаратура і мастацтва, 2010. Ёсць аднайменнае эсэ, змешчанае ў кнізе: Галубовіч, Леанід. *Сыс і кулуары. Літаратурна-крытычныя эсэ,* Мінск: Літаратура і мастацтва, 2010, с. 4–24. Адпаведна з аўтарскім правам і элементарнай этыкай трэба было назваць тыя публікацыі, якія цытуюцца ў кнізе: успаміны Алеся Бяляцкага, Сержука Сыса, Віктара Шніпа, Алеся Аркуша. Згадаўшы манаграфію пра „Тутэйшых" Аксаны Бязлепкінай *Разам і паасобку: таварыства „Тутэйшыя". Гісторыя. Асобы. Жанры.* (Biazlepkina, 2003) варта было б згадаць і манаграфію Ганны Кісліцынай *Новая літаратурная сітуацыя. Змена культурнай парадыгмы*, дзе таксама нямала старонак прысвечана „Тутэйшым" і Анатолю Сысу (Kislicyna, 2006, s. 43–74).

Сярод іншых недахопаў кнігі Андрэя Мельнікава трэба адзначыць асобныя фактаграфічныя памылкі. Напрыклад, на с. 27 паведамляецца, што „у сярэдзіне 85-га зборнік *Агмень* (пад умоўнай назвай *Краіна верасаў*) паставілі ў план выдання бібліятэчкі часопіса „Маладосць" на 1988 год (Mielnikau, 2017, s. 27). Але ў 1985 г. бібліятэчкі часопіса „Маладосць" яшчэ не існавала, адпаведна не было ніякіх планаў выдання (магчыма, маецца на ўвазе зборнік *Пан Лес*, запланаваны ў выдавецтве „Мастацкая літаратура"). Рэспубліканская нарада „Тутэйшых" адбылася не 15 траўня 1989 г., як піша Мельнікаў (Mielnikau, 2017, s. 33), а 15 траўня 1988 г. (у траўні 1989 г. „Тутэйшыя", фактычна, ужо не існавалі). Маладзенькая Аксана Бязлепкіна ніколі не была ў кватэры Анатоля Сыса і не выказвала сваё „фі" багемнай кампаніі і яе босу, як распавядае Мельнікаў (Mielnikau, 2017, s. 48): яна проста адмовілася ад прапановы нецвярозага паэта прыехаць з бутэлькай гарэлкі і палкай ліверкі ўзяць інтэрв'ю (Biazlepkina, 2005, s. 200). Суседку Анатоля Сыса, вядомую паэтку Алу Канапельку Мельнікаў называе ў кнізе то Адай (Mielnikau, 2017, s. 48), то Алай (Mielnikau, 2017, s. 52), то Ганнай (Mielnikau, 2017, s. 59) і інш.

Зрэшты, памылкі і недакладнасці здараюцца не толькі ў навукова-папулярных, але і ў навуковых выданнях, тым больш, калі апісваюцца падзеі трыццацігадовай даўніны. Галоўнай заганай кнігі Андрэя Мельнікава з'яўляюцца не фактаграфічныя памылкі і бібліяграфічныя лакуны, а даследчыцкія надінтэрпрэтацыі і сумнеўныя алюзіі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

Напрыклад, жартаўлівую мянушку „Анатоль Ціханавіч", якую даў Сысу вядомы паэт Рыгор Барадулін, Мельнікаў звязвае з украінскім дысідэнтам Марчанкам (1933–1986):

> У колах антысаветчыкаў словазлучэнне Анатоль Ціханавіч звязвалася з простым хлопцам украінскага паходжання па прозвішчы Марчанка, які, патрапіўшы маладым у лагер для палітзэкаў, здолеў напісаць пра тое магутныя ўспаміны, а затым стаў гарачым і самаахвярным, больш за тое, нязломным змагаром за вызваленне палітычных вязняў СССР, паважаным і цанімым у дысідэнцкім асяроддзі (Mielnikau, 2017, s. 35).

Напэўна такая алюзія здзівіла б і Анатоля Сыса, і самога Рыгора Барадуліна, які шчодра раздаваў жартаўлівыя мянушкі і характарыстыкі многім калегам па пісьменніцкаму цэху. Наколькі памятаю, іранічнае барадулінскае „Анатоль Ціханавіч" узнікла як рэакцыя на зоркавую хваробу Сыса і ягоную манеру звяртацца да ўсіх пісьменнікаў „на ты", у тым ліку да Барадуліна, Гілевіча, Панчанкі, Танка. Дарэчы, Ніл Гілевіч таксама звяртаўся часам да Сыса „Анатоль Ціханавіч", а за вочы называў яго „Анатоль Шыз".

Аналізуючы верш Сыса *Адвечным шляхам,* з прысвячэннем „Ахвярую А.Р", Андрэй Мельнікаў пытаецца ў чытача:

> Вас не інтрыгуе, хто хаваецца за ініцыяламі А.Р.? Алесь Разанаў? А мо Аляксандр Рыгоравіч?[1]
> Апошняе занадта – проста. А тое, што перад ім – ну зусім прароцтва! Усё ж адбылося, разумееце?! І А.Р. вырас, і дзеці ягоныя... А калі б быў Алесь Разанаў – дык нашто яго пазначаць проста ініцыяламі? Пагадзіцеся, ёсць у тым прысвячэнні таямніца (Mielnikau, 2017, s. 43).

Звабіўшы даверлівага чытача смелай гіпотэзай, аўтар кнігі „забывае" паведаміць, што верш *Адвечным шляхам* напісаны яшчэ ў часы гарбачоўскай перабудовы і апублікаваны ў зборніку зборніку *Пан Лес* (1989). Каб высветліць сапраўднае, а не зашыфраванае стаўленне Анатоля Сыса да Лукашэнкі, дастаткова працытаваць інтэрв'ю паэта з Міхасём Скоблам для Радыё „Свабода" (27.10.2002):

> Тыраны былі, ёсць і будуць. І нічога з гэтым не паробіш. Але Л. – не тыран. Ён не тое, што заблудзіўся, у яго – амбіцыі. І няхай ён кіне свае амбіцыі. У нас адная Радзіма, у нас адная зямля і хлеб. На нядаўнім пісьменніцкім з'ездзе я падпісаў і перадаў яму сваю кніжку з гэткім надпісам: „Алесь, любі Беларусь, любі сваю маці. Яна ў цябе старэнькая, як і ў мяне! Дык беражы яе!" (Sys, 2006, s. 419).

[1] Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка – прэзідэнт Беларусі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

Як ужо адзначалася на пачатку рэцэнзіі, кніга *Анатоль Сыс. Псальмяр эпохі перагною* уяўляе сабой сінтэз біяграфічнага нарыса з элементамі літаратуразнаўчага даследавання. І хаця аўтар кнігі менавіта літаратуразнаўчыя рэфлексіі над творчасцю Сыса лічыць найбольш арыгінальнай часткай кнігі, але насамрэч літаратуразнаўчыя плынь выразна саступае біяграфічнай.

Па-першае, вершы Сыса разглядаюцца не ў кантэксце творчай эвалюцыі паэта паралельна з яго жыццяёвай біяграфіяй, а аналізуюцца без усялякай храналагічнай паслядоўнасці паводле адвольнага асацыятыўна-тэматычнага прынцыпу, што вельмі заблытвае чытача. Напрыклад, верш *...З чаго пачаць? Пачну з Радзімы,* якім адкрываўся першы зборнік Сыса *Агмень* (1988), аналізуецца толькі на 45-й старонцы кнігі, пасля знакавага верша *Пацір* са зборніка *Пан Лес* (1989) і літаральна побач з вершам *Перад Богам,* якім па задуме паэта мусіў адкрывацца яго трэці зборнік *Ягамосць* (пачатак 90-х гг.). Толькі ў заключным раздзеле кнігі Мельнікава – *Сысаў Псалтыр* – прынцып выбару цытат не выклікае пярэчанняў: цытуюцца познія вершы паэта, такія як *Самотны*, *Беларусь мая, мая магіла...*, *Пчаліная матка.*

Цяжка пагадзіцца з высновай Андрэя Мельнікава, што галоўнай кнігай Анатоля Сыса застаецца зборнік *Сыс* – беларускі псалтыр (Mielnikau, 2017, s. 61). Гэты зборнік выбраных вершаў быў выдадзены ў 2002 г. амаль без удзелу паэта, нават назву прыдумаў не сам аўтар. Няўдалая нарцыстычная назва *Сыс,* такое ж прэтэнцэзійнае афармленне (на вокладцы змешчаны фотакалаж: распрануты да пояса Сыс не ў лепшай кандыцыі ўглядаецца ў Сыса), дзіўная кампазіцыя кнігі: спачатку змешчаны *Пан Лес*, потым *Агмень* (без паэмы *Агонь-птушка),* потым *Ягамосць* (не выдадзены ў 90-х гг. зборнік).

Сам Анатоль Сыс выказваўся пра гэтую кнігу досыць легкадумна і зняважліва:

> Я хацеў назваць кніжку *Лён*. Але яе афармляў мастак Аляксей Марачкін, і ён прапанаваў назваць яе *Сыс*. А мне што? Кажу – назаві мяне хоць чыгуном, толькі ў печ не стаў. […] А калаж той прыдумаў таксама Марачкін. Ён, мабыць, паленаваўся маляваць. Паклікаў сына Ігара, ён таксама мастак. Той прыйшоў з лічбавай фотакамерай, я распрануўся да пояса, яны мяне фатаграфавалі. А потым далі здымкі на вокладку. А мне й так добра (Sys, 2006, s. 416).

Параўноўваючы зборнік *Сыс* з пасмяротным выданнем спадчыны паэта *Лён* (2006, укладальнік Міхась Скобла), адназначна пераконваешся, што *Лён* з'яўляецца на сённяшні дзень найбольш грунтоўнай і кананічнай кнігай Анатоля Сыса. Тым не менш, менавіта выпадковая кампазіцыя зборніка *Сыс* натхніла Андрэя Мельнікава зрабіць наступную выснову:

> Усё разам пры паралельным чытанні з *Псалтыром* нечакана стала выглядаць каментаром да яго, беларускім сведчаннем пра нашыя светапогляд, святыні, здані

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

> і пачвары. Ад першага верша *Неапаленая купіна*, паралельна з першай псальмай, да апошняга *Пра сына*, паралельна са сто пяцьдзесят першай, якая таксама пра сына (Mielnikau, 2017, s. 54).

Прапанаваная інтэрпрэтацыя паэзіі Сыса – вельмі смелая і арыгінальная, хаця, на мой погляд, не вельмі пераканаўчая. Асобныя вершы Анатоля Сыса нагадваюць псалмы, іншыя, як падкрэслівае сам Андрэй Мельнікаў, больш падобныя на казанні-прытчы (Mielnikau, 2017, s. 35), некаторыя нагадваюць апокрыфы і г.д. Называючы Анатоля Сыса Прарокам і сакралізуючы ягоную паэзію, у якой паганскія матывы цесна пераплятаюцца з хрысціянскімі, а малітоўныя парывы змяняюцца блюзнерствам, трэба быць асцярожным і памятаць, што „ні ў аднаго нашага паэта не было такога (у пэўным сэнсе, небяспечнага) падыходу ў *адносінах* з Тым, хто спраўдзіў Талент і ўзнагародзіў ім" (Hałubowicz, 2017, s. 19).

Зрэшты, кожная літаратуразнаўчая інтэрпрэтацыя ў той ці іншай ступені суб'ектыўная, а кніга *Анатоль Сыс. Псальмяр эпохі перагною* – гэта біяграфічны нарыс, а не навуковая манаграфія. І як біяграфічны нарыс жыцця Анатоля Сыса – чарговы і, думаецца, не апошні – яна выконвае сваю функцыю: набліжае чытачу асобу неардынарнага паэта і адлюстроўвае той няпросты час, у які ён жыў. Як слушна сцвярджае Андрэй Мельнікаў напрыканцы кнігі: „Анатоль Сыс зрабіў хай і значна менш, чым яму было дадзена звыш, але і за тое будзьма яму ўдзячнымі і, наколькі здольныя, пастараемся скарыстацца найлепшым чынам тым, што ён пакінуў" (Mielnikau, 2017, s. 62).

Siergiej Kowalow

Bibliografia

Źródła

Mielnikau, Andrej. (2017). Anatol Sys. Psalmiar epochi pierahnoju. Minsk: Harwiest. [Мельнікаў, Андрэй. (2017). *Анатоль Сыс. Псальмяр эпохі перагною*. Мінск: Харвест].

Sciepanienka, Mikoła. (2006). A wandalam skaży: ja wieczny. Uspaminy pra Anatola Sysa. *Dziejaslou*, 2(21), s. 188–197. [Сьцепаненка, Мікола. (2006). „А вандалам скажы: я – вечны..." Успаміны пра Анатоля Сыса. *Дзеяслоў*, 2(21), с. 188–197].

Sys, Anatol. (2006). *Lon: wybranyja twory.* Minsk: Knihazbor. [Сыс, Анатоль. (2006). *Лён: выбраныя творы.* Мінск: Кнігазбор].

Sys, Anatol. (2007). „Lubicie nas takimi, jakimi stwaryli…" Hutarka Alesia Lipaja z Anatolem Sysom. *Dziejaslou*, 5(30), s. 265–273. [Сыс, Анатоль. (2007). „Любіце нас такімі, якімі стварылі...". Гутарка Алеся Ліпая з Анатолем Сысом. *Дзеяслоў*, 5(30), с. 265–273].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 26/11/2026 20:40:28

Opracowania

Biazlepkina, Aksana. (2003). *Razam i paasobku: tawarystwa „Tutejszyja". Historyja. Asoby. Żanry.* Minsk: Knihazbor. [Бязлепкіна, Аксана. (2003). *Разам і паасобку: таварыства „Тутэйшыя". Гісторыя. Асобы. Жанры.* Мінск: Беларускі кнігазбор].

Biazlepkina, Aksana. (2005). Pentchauz dla Sysa. *Arche*, 4(21), s. 200–204. [Бязлепкіна, Аксана. (2005). Пентхауз для Сыса. *Arche,* 4 (21), с. 200–204].

Hałubowicz, Leanid. (2010). „Jak szarawaja małanka". Narys życcia i tworczasci Anatola Sysa. U: Halubowicz, Leanid. *Sys i kułuary. Litaraturna-krytycznyja ese* (s. 4–24). Minsk: Litaratura i mastactwa. [Галубовіч, Леанід. (2010). „Як шаравая маланка". Нарыс жыцця і творчасці Анатоля Сыса. У: Леанід Галубовіч. *Сыс і кулуары. Літаратурна-крытычныя эсэ* (с. 4–24). Мінск: Літаратура і мастацтва].

Kislicyna, Hanna. (2006). *Nowaja litaraturnaja situacyja. Zmiena kulturnaj paradyhmy.* Minsk: Lohwinau. [Кісліцына, Ганна. (2006). *Новая літаратурная сітуацыя. Змена культурнай парадыгмы.* Мінск: Логвінаў].